XV нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі
Мала Радзіма-2015

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 105 (27963) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

САПРАЎДНАЕ СВЯТА МАСТАЦТВАЎ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў і гасцей XV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі з адкрыццём форуму.

«Гэты ўнікальны творчы форум сёння па праве можна лічыць адным з найбуйнейшых і значных у Беларусі. Кожны год ён развівае і ўзбагачае свае добрыя традыцыі па папулярызацыі айчыннага мастацтва», — гаворыцца ў віншаванні.

Праграма сёлетняга фестывалю раскрывае шырокую панараму творчых дасягненняў у сферы сучаснай песні і паэзіі, дорыць радасць сустрэч з вядомымі артыстамі, паэтамі, кампазітарамі і адкрывае новыя зорныя імёны.

«Сімвалічна, што менавіта ў Год моладзі ў рамках фестывальнай праграмы праводзіцца юбілейны XV Нацыянальны конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што фестываль чарговы раз пацвердзіць свой высокі статус сапраўднага свята мастацтваў.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў канкурсантам яркіх і ўдалых выступленняў, а ўсім удзельнікам і гасцям — здароўя, поспехаў, новых дасягненняў, шчасця і дабрабыту.

ЛІЧБА ДНЯ

315 **Больш за млн рублёў**

склала максімальная стаўка на таргах за дамены ў даменнай зоне ***.бел****. Учора завяршыўся першы дабрачынны аўкцыён за кірылічныя даменныя імёны, лідарам якога стаў дамен* ***авто.бел****, які быў прададзены за названую суму. Акрамя яго, на вяршыні спіса апынуліся даменныя імёны* ***дом.бел*** *(Br52 млн),* ***виза.бел*** *(Br48 млн),* ***бумага.бел*** *(Br35,05 млн),* ***агротуризм.бел*** *(Br20,1 млн). Дабрачынныя аўкцыёны будуць праходзіць два разы на месяц да 1 кастрычніка 2015 года. Атрыманыя сродкі, за выключэннем кошту рэгістрацыі дамена, будуць накіраваны ў арганізацыі, якія забяспечваюць падтрымку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Дарэчы, да гэтага самым дарагім даменам за гісторыю аўкцыённых таргоў у беларускай даменнай зоне быў* ***casino.by*** *з рэкорднай аплочанай стаўкай у Br250 млн.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.06.2015 г.

Долар ЗША	15130,00	▲
Еўра	17031,00	▲
Рас. руб.	274,36	▼
Укр. грыўня	718,76	▲

ISSN 1990 - 763X
9 771990 763008 15105

■ Сёння — Дзень аховы навакольнага асяроддзя

Апошнім часам вушастыя совы сталі гарадскімі жыхарамі: селяцца зусім побач з людзьмі, гадуюць птушанят. А тыя, калі пачынаюць вучыцца лётаць, трапляюць у самыя нечаканыя і небяспечныя месцы. Напрыклад, у Быхаве вушастыя дзіцяняткі аблюбавалі самы цэнтр горада. Ім на дапамогу прыходзіць спецыялістка раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ірына Красікава. Яна ловіць неразумных подлеткаў і пераносіць іх у больш бяспечнае месца, дзе бацькі іх абавязкова знойдуць.

МЫ З ІМІ АДНОЙ КРЫВІ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Лета з карысцю для здароўя

У САНАТОРЫЯЎ — ГАРАЧЫ СЕЗОН

Лета — гэта адпачынак. Як правесці яго з карысцю для здароўя і пры гэтым нясумна? Чаму аддаць перавагу: замежнаму курорту ці беларускаму санаторыю? І калі вы схіляецеся да айчыннага санаторыя, ці магчыма яшчэ забраніраваць пуцёўку? Якім будзе яе кошт, а таксама якімі новымі відамі паслуг гатовы парадаваць нас беларускія здраўніцы? Пра ўсё гэта распавёў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў Генадзь БАЛБАТОЎСКІ на анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.

СТАР. 3

■ Прэм'ера

ПТУШКА ШЧАСЦЯ: ВЯРТАННЕ

Гэта ж цуд: канікулы пачаліся — і якраз Беларускі рэспубліканскі Тэатр юнага гледача адкрыўся пасля рэстаўрацыі. Што яшчэ трэба для шчасця? Аказалася — вось гэта і трэба бацькам і дзецям. Таму напачатку іх і віталі сімвалічнай казкай з цудамі «Сіняя птушка» Марыса Метэрлінка. Прэм'ера на адкрыццё. І нібыта ўсе толькі таго і чакалі, калі тэатр вернецца дадому: зала на 323 месцы запаўнялася гледачамі.

Яны пачалі сцягвацца задоўга да спектакля. Купка дзяўчатак прыйшла, аглядваюцца. Зайшлі ў фае — на экране дэманструецца афіша з усімі спектаклямі тэатра. Асцярожна сядаюць. Як жа інакш, калі ўсё блішчыць: урачыстыя жырандолі зззяюць усімі гронкамі празрыстых хрусталікаў.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

ПРАЕКТ ДЫНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

Патэнцыял Беларусі і Індыі дае магчымасць вывесці гандлёвае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва краін на больш высокі ўзровень.

Упэўненасць у гэтым выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на адкрыцці беларуска-індыйскага бізнес-форуму. Удзел у мерапрыемстве прыняў таксама Прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы, які знаходзіўся ў Беларусі з афіцыйным візітам, — паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў устойлівыя тэндэнцыі да росту таваразвароту паміж дзвюма краінамі апошнім часам. У той жа час Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для патэнцыялу краін узровень гандлю зусім невялікі.

«Таму нам трэба, і ў ходзе гэтага форуму ў тым ліку, дамовіцца аб тым, каб гэты таваразварот на працягу ўжо наступнага года можна было падвоіць. І для гэтага ў нас ёсць усё неабходнае», — пераканаўчы беларускі лідар.

Паводле яго слоў, у эканамічных адносінах Беларусі і Індыі намеціўся паступовы пераход ад простага гандлю да вытворчай кааперацыі, у чым зацікаўлены абодва бакі. У Індыі адкрыты прадстаўніцтвы вялікіх беларускіх прадпрыемстваў. Прапрацоўваецца магчымасць стварэння сумесных зборачных вытворчасцяў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што разглядаюцца пытанні ўдзелу Беларусі ў мадэрнізацыі індыйскіх нафта- і вуглездабыўных магутнасцяў.

Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што Беларусь і Індыя могуць узмацніць узаемадзеянне ў прамысловасці, энергетыцы, лагістыцы, сувязі, бія- і нанатэхналогіях. Беларускі бок зацікаўлены таксама ў развіцці сумесных вытворчасцяў у галіне фармакалогіі, інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій.

«Такія прадпрыемствы мы будзем ствараць у індустрыяльным парку «Вялікі камень», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Ён запрасіў прадстаўнікоў індыйскіх дзелавых колаў больш дэталёва азнаёміцца як з патэнцыялам парка, так і ў цэлым краіны.

«Адкрыўшы вытворчасці ў Беларусі, вы зможаце скарыстацца бесперашкодным выхадам на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза і асвойваць рынкі Еўрапейскага саюза, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Вы добра разумееце, што лепшай лагістыкі для работы ў гэтых двух саюзах быць не можа, таму што Беларусь геаграфічна знаходзіцца ў самым цэнтры гэтых эканамічных гігантаў».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асаблівае значэнне Беларусь надае супрацоўніцтву на ўзроўні рэгіёнаў. На яго думку, такое ўзаемадзеянне дасць магчымасць напаўняць двухбаковыя гандлёва-эканамічныя сувязі новым зместам. Прэзідэнт дадаў, што прыкладам могуць служыць прамыя кантакты Беларусі з суб'ектамі Расійскай Федэрацыі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў надзею, што бізнес-форум будзе карысным для ўсіх удзельнікаў, а яго вынікам стане з'яўленне новых цікавых і ўзаемавыгадных праектаў.

«У наш няпросты час вельмі многія прадпрымальнікі, бізнесмены, кіраўнікі вялікіх прадпрыемстваў гавораць аб крэдытаванні, фінансаванні больш выгадным і льготным, — адзначыў беларускі лідар. — У выніку нашых апошніх візітаў і дамоўленасцяў у Азіяцкім рэгіёне — з Кітайскай Народнай Рэспублікай, Пакістанам, Індыяй, раней В'етнамам і іншымі дзяржавамі — праблем з крэдытамі няма, і гэта вельмі выгадныя крэдыты».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў час апошняга візіту ў Беларусь старшыні КНР Сі Цзіньпіна дасягнута дамоўленасць аб выдзяленні Беларусі $7 млрд крэдытных рэсурсаў дадаткова да $15 млрд, выдадзеных раней пад невялікі працэнт. Прэзідэнт Індыі на сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы, праведзенай 3 чэрвеня, адзначыў, што ўрад Індыі падтрымлівае індыйскія і беларускія кампаніі і будзе даваць ім ільготныя крэдыты.

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што сродкі павінны накіроўвацца на эфектыўныя праекты. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ім прынята рашэнне не падзяляць у гэтым выпадку прадпрыемствы на дзяржаўныя і прыватныя. «Усе маюць права і могуць атрымаць гэтыя крэдыты пад развіццё вытворчасці», — сказаў ён.

«Таму, я сказаў бы, упершыню ў гісторыі ў Беларусі створаны такія ўнікальныя ўмовы для работы бізнесу. Галоўнае — гэта праекты. Скажу шчыра, іх проста не хапае сёння. Таму што стаў больш строгім падыход да іх: проста так, без усялякіх гарантый, вырабляць і на склад складаць прадукцыю ў наш час — справа дрэнная. Таму ёсць добры праект — будзем падтрымліваць, будзем фінансаваць», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што візіт у Беларусь Пранаба Мукерджы сведчыць аб многім. «Прыехала вялікая група вядучых бізнесменаў Індыі, а гэта ні многа ні мала краіна, якая з'яўляецца адным з лідараў эканамічнага развіцця ў свеце, гэта гіганцкая імперыя, якая мае каласальныя магчымасці і рэсурсы. Што яшчэ трэба для беларускіх бізнесменаў, каб развіваць свой бізнес і актыўна працаваць? Калі патрэбна дадатковая падтрымка для беларускіх кампаній і індыйскіх — вы такую падтрымку заўсёды атрымаеце. І перш за ўсё ад мяне», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што Беларусь зробіць усё для таго, каб індыйскія бізнесмены, якія прыйшлі ў краіну, ніколі не сказалі пра Беларусь дрэнна або паскардзіліся на дрэнныя ўмовы. «Умовы будуць створаны ў Беларусі для вашых кампаній як для самых лепшых сяброў», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на паспяховае ўзаемадзеянне індыйскіх і беларускіх спецыялістаў па рэканструкцыі Гродзенскай ЦЭЦ-2. «Калі яны будуць так працаваць, вы можаце не клапаціцца аб праектах у Беларусі, мы заўсёды падтрымаем такія праекты. Гэта высокая якасць, гэта надзейнасць, і паказчыкі нават вышэйшыя, чым нам гарантавалі і абяцалі індыйскія калегі. Вось такія праекты мы вітаем тут у цэнтры Еўропы. Мы будзем іх заўсёды падтрымліваць», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«У той жа час нашы кампаніі, якія прыйдуць у Індыю, будуць працаваць у імя Індыі, індыйскага народа, будуць рабіць усё, каб той прадукт, які мы там будзем выпускаць разам з вамі, не меў нараканняў з боку спажыўцоў. У гэтым вы можаце быць упэўнены», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У рамках бізнес-форуму з удзелам прэзідэнтаў Беларусі і Індыі адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця памятнага знака, прысвечанага ўзаемадзеянню індыйскіх і беларускіх спецыялістаў па рэканструкцыі Гродзенскай ЦЭЦ-2.

БУДЗЕМ ДРУЖЫЦЬ ПАРЛАМЕНТАМІ

Індыйскі бок чакае візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі на чале са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам Андрэйчанкам.

Фота БЕЛТА.

У час сустрэчы старшынь абедзвюх палат Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА і Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ з Прэзідэнтам Індыі Пранабам МУКЕРДЖЫ.

Аб гэтым было заяўлена на сустрэчы старшынь абедзвюх палат Нацыянальнага сходу Беларусі з Прэзідэнтам Індыі Пранабам Мукерджы, паведаміў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Віталь Бусько.

«Прызнаны мэтазгодным абмен парламенцкімі дэлегацыямі ў найбліжэйшы час. Прэзідэнт Індыі заявіў, што яны з нецярпеннем чакаюць парламенцкую дэлегацыю на чале са спікерам, каб абмеркаваць узнятыя на сённяшняй сустрэчы пытанні з удзелам дэпутацкага корпуса», — сказаў Віталь Бусько.

Таксама дэпутат звярнуў увагу, што сустрэча прайшла ў даволі шырокім фармаце. З беларускага боку ў ёй прымалі ўдзел не толькі прадстаўнікі абедзвюх палат парламента, але таксама віцэ-спікеры і іншыя парламентарыі. Бакі канстатавалі наяўнасць добрых адносін, у тым ліку маецца на ўвазе стварэнне груп дружбы ў парламентах абедзвюх краін.

■ Тры пытанні да ўлады

КРЭПАСЦЬ НЕ АБМІНАЕ НІВОДНАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ

У праграме X Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні: спадчына Вялікай Перамогі», які распачнецца днямі ў сталіцы, значыцца наведванне яго ўдзельнікамі Брэсцкай вобласці і, вядома, Брэсцкай крэпасці. Падрыхтоўку да сустрэчы курыруе начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама Аляксандр МУРАШКІН. Да яго — нашы пытанні.

— Што ўбачаць, з кім сустрэнуцца ў Брэсце супрацоўнікі друкаваных сродкаў інфармацыі і тэлеканалаў з Беларусі і замежжа?

— Пакуль што плануецца наведванне прадстаўнікамі масмедыя нашага брэндавага прадпрыемства «Савушкаў прадукт». Яно і зразумела: многія спажыўцы за мяжой добра ведаюць малочныя прадукты брэсцкага прадпрыемства. Думаю, ім цікава будзе паглядзець на саму вытворчасць «Брэст-Літоўскай» смятаны або тварагу, сустрэцца з працаўнікамі камбіната.

Пра асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна гасцям раскажа старшыня аблвыканкама Анатоль Ліс. Губернатар пазнаёміць удзельнікаў форуму з некаторымі аспектамі супрацоўніцтва Брэстчыны з суседнімі краінамі і рэгіёнамі асобных краін. Пасля гэтага госці наведаюць мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», ускладуць кветкі да Вечнага агню.

— У крэпасці апошнія месяцы і дні практычна кожны дзень бываюць не толькі турысты, але і афіцыйныя дэлегацыі. Ці звязана гэта, на ваш погляд, з юбілейнай датай Перамогі, якую мы ўсе адзначаем?

— І так, і не. Жаданне наведаць нашу галоўную славутасць, як правіла, выказваюць усе госці горада, якія прыязджаюць з дзелавымі мэтамі. У красавіку памяць абаронцаў крэпасці ўшанавалі еўрапейскія дыпламаты, грамадскія дзеячы на чале з кіраўніком прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Майрай Морай. Літаральна некалькі дзён таму кветкі да галоўнага манумента цытадэлі ўсклаў губернатар Пскоўскай вобласці Андрэй Турчак.

А на святкаванне Дня Перамогі да нас прыязджала сапраўды шмат гасцей. Напрыклад, афіцыйныя дэлегацыі былі са Славакіі, Інгушэціі, Нідэрландаў. Варта адзначыць, што для нас не менш важныя сталі і тыя госці, якія ехалі не ў складзе дэлегацый, але праявілі ўласную ініцыятыву, не паленаваліся пераадолець многія тысячы кіламетраў і сустрэць юбілей Перамогі ў Брэсце. Я маю на ўвазе жыхароў Сібіры, Уладзівастока, краін далёкага замежжа. Народная ініцыятыва спрацоўвае не толькі ў святочныя дні, што яшчэ больш каштоўна. Нядаўна экскурсавод крэпасці расказваў, што мемарыял наведала група школьнікаў з Паволжа. Аказваецца, цэлы клас перамог у адным з праектаў, якія арганізуе іх міністэрства адукацыі. Як было абумоўлена правіламі, у пераможцаў спыталі, куды яны хочуць паехаць у якасці ўзнагароды за перамогу. Дзеці назвалі Брэсцкую крэпасць. І для іх арганізавалі паездку. Гэта надзвычай прыемна было чуць. У крэпасці сёння сапраўды ёсць што паглядзець. Акрамя ранейшых аб'ектаў, якія многім вядомыя, можна наведаць новы, ён называецца «Музей вайны — тэрыторыя міру», стала магчыма заказаць паход на Пагранічны востраў, пазнаёміцца з фартыфікацыйнай сістэмай крэпасці пазамінулага стагоддзя... Так што і ўдзельнікам міжнароднага медыяфоруму будзе што паказаць.

Увогуле ж мерапрыемствы, прысвечаныя ваенным падзеям, мужнасці і гераізму, не скончыліся. Цяпер рыхтуемся яшчэ да аднаго.

— Маеце на ўвазе традыцыйны мітынг-рэквіем у чатыры гадзіны раніцы 22 чэрвеня?

— Так. Дзень усенароднай памяці ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны мы традыцыйна адзначаем тут, дзе пачалася вайна. У розныя гады мерапрыемства праходзіла па-рознаму. Аднойчы ў гэту ноч упершыню паказалі фільм «Брэсцкая крэпасць». Таксама ўпершыню тут прайшла рэканструкцыя падзей пачатку вайны, якая стала цяпер атрыбутам гэтага дня. І зноў жа па традыцыі 22 чэрвеня ў Брэст прыбывае многа гасцей. Тут мы сустракалі славутых расійскіх дзеячаў культуры, такіх як Людміла Зыкіна, Аляксандра Пахмутава, Мікалай Дабранраваў і многіх іншых. Памяць ахвяраў вайны ў ноч на 22 чэрвеня ўшаноўвалі ля сцен цытадэлі прэзідэнты і прэм'еры суседніх краін. Сёлета, як і заўсёды, ноччу прыбудуць спецыяльныя цягнікі памяці з моладдзю. Чакаем таксама Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

■ Ёсць жа людзі!

«ЧУЖЫЯ ГРОШЫ ШЧАСЦЯ НЕ ПРЫНОСЯЦЬ»

Студэнт вярнуў гаспадару згубленыя ім 1,8 тысячы долараў

У сталіцы цягам шасці дзён шукалі гаспадара знойдзенага на вуліцы пакунку з грашыма. І ўрэшце знайшлі! Сродкі вернуты, і цяпер можна расказаць пра ўсе акалічнасці гэтага здарэння. Дагэтуль яны не выдаваліся, каб па дэталях можна было дакладна ўстанавіць іх сапраўднага ўладальніка.

29 мая каля 19 гадзін на праспекце Незалежнасці мінчанін знайшоў у траве ля тратуара пакунак з грашыма. Знаходку мужчына адразу ж аднёс у Першамайскае РУУС. На той момант з заявай аб прапажы ў міліцыю ніхто не звяртаўся (як не звярнуўся і ў наступныя дні). Праваахоўнікі назвалі знойдзеную суму «даволі вялікай», не расшыфроўваючы — колькі. Сапраўдны гаспадар і павінен быў дзеля пацверджання свайго права на знаходку ўказаць дакладную суму, намінал купюр і валюту гатоўкі. Учора стала вядома, што грошы вернуты ўладальніку.

— Іх знайшоў студэнт 1993 года нараджэння. У скрутку было 1,8 тысячы долараў. Гаспадар — дзелавы чалавек, магчыма, індывідуальны прадпрымальнік. Побач з месцам згубы і месціўся яго бізнес, — распавяла «Звяздзе» прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Святлана Білінская. — Паводле слоў уладальніка сродкаў, ён паклаў іх у заднюю кішэню штаноў разам з тэлефонам. Калі садзіўся ў машыну, той зазваніў. Відаць, у гэты момант, калі грамадзянін даставаў сотавы, грошы і выпалі. Дома, не знайшоўшы валюты, ён вырашыў, што яна недзе ў машыне. Абшукаў салон, пасля чаго паехаў на тое самае месца, абшукаў і там усё, распытваў людзей. Спробы аказаліся марнымі. Чалавек, мабыць, вырашыўшы, што страчанага не вярнуць, не стаў звяртацца ў міліцыю і нават з'ехаў з горада на выхадныя. Пасля вяртання яму на вочы і трапіла інфармацыя аб пошуках гаспадара знойдзенага скрутка. Грамадзянін дакладна назваў і валюту, і намінал купюр, і суму. У апорным пункце міліцыі ён папрасіў нумар тэлефона маладога чалавека, які знайшоў грошы і аднёс іх у міліцыю, і падзякаваў яму. Сам малады чалавек вырашыў захаваць інкогніта, заявіўшы, што чужыя грошы шчасця не прыносяць.

Святлана Білінская зазначыла, што такія выпадкі, калі грамадзяне вяртаюць знойдзеныя чужыя грошы, здараюцца рэдка. «Губляюць часта, вяртаюць — не вельмі». А людзей, якія заяўлялі, што гэта яны страцілі грошы, тэлефанавала шмат: толькі за першую гадзіну пасля размяшчэння адпаведнай інфармацыі ў міліцыю звярнуліся тры чалавекі...

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Курсавая розніца

КОШТ ВАЛЮТ СТАНЕ БОЛЬШ ЗРАЗУМЕЛЫМ

А за прадухіленнем спекуляцый павінен сачыць Нацбанк

Як ужо паведамлялася, у сувязі з удасканаленнем механізмаў рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі і функцыянавання ўнутранага валютнага рынку з 1 чэрвеня на таргах замежнымі валютамі, якія арганізуюцца Беларускай валютна-фондавай біржай, перайшлі ад рэжыму фіксінгу да рэжыму бесперапыннага двайнога аўкцыёну. Расійскі эксперт кажа, што гэта пойдзе на карысць беларускай фінансавай сістэме.

АБАВЯЗАК ПА МІНІМУМУ

Бесперапынны двайны аўкцыён — гэта форма біржавых таргоў, заснаваная на канкурыраванні заявак на куплю і продаж замежнай валюты. Пры гэтым заяўкі аўтаматычна задавальняюцца ў той момант, калі з'яўляюцца дзве сустрэчныя заяўкі з цэнавымі ўмовамі, якія перасякаюцца (цана куплі супадае з цаной продажу). Таргі на нашай біржы адбываюцца ў два этапы — асноўная сесія і закрыццё сесіі. Падчас першай часткі таргоў вызначаецца сярэднеўзважаны курс, прычым мінімальны. Ён фарміруецца па нейкай спецыяльнай формуле. На закрыцці адбываецца абавязковы продаж валютнай выручкі прадпрыемствамі-экспарцёрамі. Ці існуюць з-за гэтага рызыкі спекуляцый: напрыклад, банкі правядуць здзелкі, пасля якіх усталюецца нізкі курс, а потым прадпрыемствы павінны будуць прадаваць валюту нявыгадна для іх?

Эксперт кампаніі ААТ «Бізнес-Форэкс» Міхаіл ГРАЧОЎ адказвае:

— Ва ўсім свеце ў адкрытых эканоміках факт падобнай спекуляцыі катэгарычна караецца. Аднак тут можна пралічыць верагоднасць таго, калі буйныя гульцы (напрыклад, «Беларускалій») павінны выходзіць на біржу з вялікімі аб'ёмамі выручкі. Гэта адназначныя і ўсім вядомыя даты. І нейкія «выбухі» цалкам верагодныя. А сярэднеўзважаны курс, наколькі я зразумеў з каментарыяў Беларускай валютна-фондавай біржы, фарміруецца па прынцыпе «японскай свечкі» (спецыяльны тэрмін рынку «Форэкс». — **Аўт.**). У яе ёсць чатыры ўзроўні — цана адкрыцця, цана закрыцця, максімальная і мінімальная цэны. Менавіта з гэтых паказчыкаў выводзіцца сярэдні курс для куплі валюты пры яе абавязковай здачы.

ІНТЭРВЕНЦЫІ НЕ ПРАЦУЮЦЬ

Сёння таргі на біржы цягнуцца 1 гадзіну 15 хвілін. У нашых суседзяў, у Расіі, таргі ідуць увесь дзень. Магчыма потым мы таксама будзем павялічваць гэты час?

— А што ўдзельнікі там будуць рабіць болей? Глядзець адзін на аднаго? — адказвае пытаннем на пытанне Міхаіл Грачоў. — Гэтага часу проста хапае для невялікага беларускага рынку. Аб'ём у нас сёння вагаецца каля 100 здзелак. І ён у найбліжэйшы час не зменіцца.

Дарэчы, невялікі аб'ём здзелак у першы дзень таргоў эксперты не ўспрымаюць як дрэнны паказчык. «Гэта эфект першага дня. Удзельнікі апрабавалі механізм. Пасля таго, як яны зразумелі, што сістэма працуе, з'явіліся рэальныя заяўкі», — сказаў Міхаіл Грачоў.

Вельмі цікавіць пытанне валютных інтэрвенцый з боку Нацыянальнага банка. Расійскі эксперт пагадзіўся параўнаць магчымасці цэнтральных банкаў нашых краін:

— Летась мы ўбачылі, што наш Цэнтрабанк не мае намеру выходзіць на рынак з вялікім аб'ёмам інтэрвенцый, — заявіў **аналітык кампаніі «Тэлетрэйд» Міхаіл ПАДДУБСКІ**. — Усё роўна, нават расійскіх золатавалютных рэзерваў не хопіць для падтрымання курсу на адпаведным узроўні. У многім атрымалася пагасіць паніку дзякуючы адміністрацыйнаму рэсурсу. Не было прамога загаду экспарцёрам прадаваць валюту, але пэўныя рэкамендацыі з'яўляліся. Гэта спрацавала. Тым больш рынак праглыне ўсё — колькі ты яму ні прапаноўвай. Няправільна выдаткоўваць грошы менавіта такім чынам. Лепей прапанаваць ліквіднасць, якой не хапае ўдзельнікам, узамен нейкіх абавязацельстваў.

БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ — У «ФОРЭКС»?

Міхаіл Паддубскі адказаў яшчэ на некалькі пытанняў нашага выдання:

— Ці можна пераход на двайны аўкцыён успрымаць як першы крок выхаду беларускага рубля на рынак «Форэкс»?

— Пераход да сістэмы бесперапыннага двайнога аўкцыёну — ёсць той захад, які дазволіць павысіць прывабнасць у вачах патэнцыл інвестараў. Гэта дае больш зразумелыя правілы гульні, пры якіх будзе вызначацца валютны курс. Для беларускай фінансавай сістэмы гэта на карысць.

— Значыць, гэты курс больш аб'ектыўны?

— Гэты курс фарміруецца са зразумелых фактараў. Таму ён больш зразумелы, прадыктаваны рыначнымі правіламі. Аднак казаць, што беларускі рубель ператворыцца з выключна рэгіянальнай валюты ў нейкі міжнародны плацежны сродак, безумоўна, пакуль рана.

— Наколькі магчымая спекуляцыя?

— Тэарэтычна магчымая, але для таго, каб сачыць за законнасцю, ёсць рэгулятар.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

Каментарый у тэму

Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па бюджэце і фінансах:

— Выкарыстанне рыначных інструментаў важнае, безумоўна, і на валютным рынку. Адным з іх стаў новы падыход да фарміравання курсу. У людзей часта ўзнікаюць пытанні, якім чынам ён фарміруецца, наколькі гэты працэс празрысты. Пераход да новага рэжыму таргоў на біржы, так званая лібералізацыя валютнага рынку, дазволіць зрабіць фарміраванне курсу больш адкрытым. Заўважу, што істотных усплёскаў попыту і прапановы пасля новаўвядзення не адбылося. Гэта сведчыць аб тым, што пераход да новага рэжыму таргоў адбыўся сапраўды паспяхова і будзе рэалізоўвацца надалей. Прыклад прымянення рыначнага інструмента на валютным рынку паказвае, што трэба ўводзіць інавацыі і не баяцца іх. Дарэчы, Нацыянальны банк ужо выкарыстоўвае падобныя падыходы не толькі ў гэтай сферы.

Вераніка ПУСТАВІТ.

Волковысское ОАО «Беллакт»

ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ
В ПЕРЕГОВОРАХ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДЧИКА
(генерального подрядчика)
для выполнения работ по текущему ремонту атмосферного деаэратора ДА 50/15 зав. № 62011 (зав. чертеж № 00.8133.082 СБ) и охладителя выпора ОВА-2 зав. № 66054 (зав. чертеж № 00.8118.004 СБ) котельной.
Адрес расположения объекта:
г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133.

Документация для переговоров представляется на основании заявки, направленной по e-mail: juristy@bellakt.com, по факсу +3751512 75048.
Срок представления предложений: 05.06.2015 г. по 15.06.2015 г.
УНП 500043093

ОАО «Минский завод отопительного оборудования»

ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 11 июня 2015 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29 – зал заседаний.

ПОВЕСТКА ДНЯ
внеочередного общего собрания акционеров открытого акционерного общества «Минский завод отопительного оборудования» 11 июня 2015 г.
1. Об утверждении стоимости имущества Общества.
2. О совершении крупной сделки.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться по указанному адресу (у председателя наблюдательного совета) с 1 июня по 10 июня 2015 с 10 до 16 часов.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.50 в день и по месту проведения собрания **на основании документа, удостоверяющего личность**. Кроме того, представитель акционера должен иметь доверенность (руководитель юридического лица, являющегося акционером, – документы, подтверждающие его полномочия).

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров по состоянию **на 1 июня 2015**.

Наблюдательный совет ОАО «Минский завод отопительного оборудования»

УНП 100008064

ВНИМАНИЮ
ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

Фондом «Гроднооблимущество»
по поручению отдела образования, спорта и туризма Волковысского районного исполнительного комитета
ПРОВОДИТСЯ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕИСПОЛЬЗУЕМОГО ИМУЩЕСТВА,
находящегося в собственности Волковысского района.
К продаже предлагается
ЗДАНИЕ ШКОЛЫ С ПРИСТРОЙКОЙ И ПРИНАДЛЕЖНОСТЯМИ,
расположенное по адресу:
Волковысский район, Росский сельсовет, агрогородок Дубовцы, улица Центральная, 16.
Аукцион состоится 18 июня 2015 года в 12^{00}.
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу:
город Гродно, улица 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участке в аукционе – **12 июня 2015 года до 12^{00}.**
Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске – 4-50-25;
в городе Гродно – (80152) 772915, 722518
УНП 500580576

У САНАТОРЫЯЎ — ГАРАЧЫ СЕЗОН

ПЛЮС 10 ПРАЦЭНТАЎ

Такім чынам, спачатку пра галоўнае — цану. Кошт пуцёвак на летнія месяцы ў беларускія здраўніцы ў сувязі са значным павышэннем попыту ўзрасце на 10%. Вядома, што сярэдні кошт 1 дня знаходжання па пуцёўках, што самастойна рэалізуюцца здраўніцамі, з размяшчэннем у двухмесным аднапакаёвым нумары ў красавіку склаў 391,5 тысячы рублёў. Улетку сярэдні кошт 1 дня дасягне ў сярэднім 432 тысяч рублёў.

Браніраванне пуцёвак на летні перыяд, па словах Генадзя Балбатоўскага, яшчэ адкрыта. Набыць пуцёўкі можна праз тураператараў, а таксама на сайтах санаторыяў. Найбольшым попытам карыстаюцца пуцёўкі з працягласцю знаходжання 12-14 дзён.

Прагназуецца, што ў міжсезонны перыяд (з кастрычніка па 20 снежня 2015 года) сярэдні кошт 1 дня знаходжання па пуцёўках, што самастойна рэалізуюцца здраўніцамі, зноў знізіцца на 9-10% і складзе каля 390 тысяч рублёў.

Для параўнання: кошт аднаго дня знаходжання ў літоўскіх санаторыях у Друскінінкаі стартуе ад 59 еўра.

БОЛЬШ ЗА ПАЛОВУ АДПАЧЫВАЛЬНІКАЎ АПЛАЧВАЮЦЬ ПУЦЁЎКУ ЧАСТКОВА

Штогод лячэнне і аздараўленне ў нашых санаторыях праходзяць больш як 1,3 млн чалавек. Каля 20% адпачывальнікаў штогод складаюць замежнікі. У мінулым годзе ў беларускіх санаторыях адпачылі 240 тысяч замежных грамадзян (гэта нават менш за 20% агульнай колькасці пуцёвак).

Найбольшым попытам карыстаюцца санаторыі, якія валодаюць найлепшай матэрыяльнай базай. Калі казаць пра сталічны рэгіён, то запатрабаваны санаторыі «Юнацтва», «Баравое», «Прыазёрны». Гэтыя санаторыі, па словах Генадзя Балбатоўскага, прадастаўляюць паслугі сусветнага ўзроўню.

Плануецца, што ў гэтым годзе за кошт сродкаў юрыдычных і фізічных асоб пройдуць аздараўленне больш за 560 тысяч чалавек, а за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва — больш за 650 тысяч чалавек.

Тэрмін чакання пуцёўкі ў санаторыі для пенсіянераў складае ў сярэднім па краіне 3-4 гады ў залежнасці ад рэгіёна. Некалькі большы гэты тэрмін у Мінску — 5 гадоў, што звязана з большай сацыяльнай актыўнасцю сталічных пенсіянераў. Што тычыцца непрацуючых грамадзян, у якіх інваліднасць першай-другой груп, то яны забяспечваюцца пуцёўкамі адзін раз у два гады.

Як заявіў Генадзь Балбатоўскі, індывідуальныя прадпрымальнікі таксама маюць права на атрыманне пуцёўкі, як і любыя працуючыя грамадзяне, на ўмовах частковай аплаты. Для гэтага ім трэба звярнуцца да спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва. Індывідуальны прадпрымальнік павінен прадставіць даведку аб даходах, у залежнасці ад якіх будзе налічаны памер частковай аплаты. Альбо гэта можа быць інфармацыя пра тое, як ён выплачвае фіксаваны падатак, гэта таксама паўплывае на налічэнне частковай аплаты за пуцёўку. Яна будзе выдадзена пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў.

КАТЭДЖЫ, ШВЕДСКІ СТОЛ, БУРШТЫНАВЫЯ ПАКОІ...

У апошні час у курортнай зоне Нарачанскага рэгіёна практычна ва ўсіх санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях з'явіліся катэджы. Драўляныя домікі і двухпавярховыя карпусы пабудаваны таксама ў дзіцячых санаторыях «Расінка» і «Сонейка», дзе ствараюцца аддзяленні маці і дзіцяці. Гэтае новаўвядзенне, па словах спецыялістаў, сябе апраўдала і будзе развівацца ў беларускіх здраўніцах далей, бо людзі хочуць адпачываць камфортна.

Яшчэ адна навінка — у беларускіх санаторыях будзе арганізаваны шведскі стол гародніны, зеляніны і садавіны ці фруктова-агародніннyя бары.

Таксама беларускія санаторыі актыўна развіваюць новыя віды паслуг, у тым ліку даволі экзатычныя (напрыклад, лячэнне п'яўкамі, пчоламі і г.д.). Цікавым новаўвядзеннем спецыялісты называюць стварэнне бурштынавых пакояў. Гэта спецыяльныя памяшканні з прыродным бурштынам, знаходжанне ў якіх спрыяльна ўплывае на лячэнне захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы, шчытападобнай залозы, бранхіяльнай астмы, захворванняў цэнтральнай нервовай сістэмы і многіх іншых. Пры падагрэве пасудзін з бурштынам інтэнсіўна вылучаюцца фітанцыды. Але ў такіх пакоях бурштын знаходзіцца не толькі ў посудзе — ім цалкам пакрыты сцены, столь, падлога. Бурштынавыя пакоі ўжо абсталяваны ў санаторыях «Рассвет» (г. Любань Мінскай вобласці) і «Парэчча» (пасёлак Парэчча ў Гродзенскай вобласці). У найбліжэйшай перспектыве бурштынавыя пакоі з'явяцца і ў іншых санаторыях «Белаграздраўніцы».

Усяго да паслуг ахвотных адпачыць і падлячыцца — 111 санаторна-курортных і 233 аздараўленчыя арганізацыі Беларусі.

Святлана БУСЬКО.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«РАДЗІМАЯ МЯДОЦКАЯ ЗЯМЛЯ, ЧАСЦІНКА НАШАЙ ЛЮБАЙ БЕЛАРУСІ!»

Гэта ўрывак з верша Антаніны Абрамовіч, які размешчаны на вокладцы кнігі-прысвячэння, кнігі-прызнання ў любові да роднага Мядоцкага краю — Барысаўшчыны, а дакладней — вёскі Леванова Барысаўскага раёна. Чым адметная гэта вёска, што ёй прысвяцілі цэлую кнігу? Тым, што яна — выбітны прыклад адносін да яе землякоў, якія, дзе б ні былі, раз на год улетку стараюцца абавязкова прыехаць для сустрэчы на малой радзіме. Сярод ураджэнцаў Леванова мноства славутых людзей — дактароў, настаўнікаў, бізнесменаў і іншых таленавітых дзеячаў. Тут убачылі свет і міністр транспарту і камунікацый Іван Шчэрба, і міністр інфармацыі Лілія Ананіч.

Сустрэчы землякоў у Леванове сталі добрай традыцыяй.

Менавіта Лілія Ананіч на адной са штогадовых сустрэч з аднавяскоўцамі прапанавала ім занатаваць свае ўспаміны і ўзяла на сябе абавязак выдаць кнігу. І вось заўтра на святе, прысвечаным 130-годдзю Леванова, адбудзецца яе прэзентацыя. Называецца гэты твор «Землякі», падрыхтавала яго выдавецтва «Чатыры чвэрці». Наклад невялікі — усяго 250 экзэмпляраў, але ж важная тут не колькасць, а тое, што кнігу змогуць атрымаць людзі, для якіх яна сапраўды стане каштоўнасцю.

«Праца над кнігай ішла вельмі душэўна. Яшчэ днямі Лілія Станіславаўна перадавала нам фотаздымкі, знайшла магчымасць гэта зрабіць, хоць сама ў той час прысутнічала на нарадзе. Выданне хоць і не выглядае альбомным, але да яго стварэння спрычынілася шмат людзей. Разгарнулася тут і праца дызайнерскай думкі: сама кніга чорна-белая, але ў ёй прысутнічаюць каляровыя ўстаўкі з фотаздымкамі папярэдніх сустрэч землякоў. І самае галоўнае, што падрыхтоўка гэтай кнігі падштурхнула выдавецтва да стварэння новай серыі «Малая радзіма», прысвечанай розным рэгіёнам Беларусі. Мы спадзяёмся, што многія беларусы захочуць расказаць пра сваю малую радзіму, падзяліцца сваімі ведамі і пачуццямі», — распавяла «Звяздзе» **адна з укладальніц кнігі, дырэктар выдавецтва «Чатыры чвэрці», ураджэнка Барысаўшчыны Лілія на АНЦУХ.**

У кнізе сабраны і падрабязнасці жыцця саміх людзей, і гістарычныя падзеі, якія ім давялося перажыць. Упершыню апублікаваны інтэрв'ю-ўспаміны 28 леваноўцаў. Часам яны прастадушныя, часам — дакументальна-біяграфічныя, лёсы многіх землякоў падкрэслены паэтычна-песенным зместам. Усё гэта дапоўнена гістарычнымі нарысамі, артыкуламі СМІ, у тым ліку «Звязды», а таксама дакументамі і фотаздымкамі. Жыццё адной невялікай вёскі разгорнута паказана на фоне развіцця цэлага краю. Распавядаецца і пра станаўленне мясцовай адукацыі, і пра праваслаўнае жыццё ў Мядоцкім краі. Збіраць звесткі выдаўцам дапамагалі вядомыя на Барысаўшчыне людзі — гісторык Аляксандр Балябін, пісьменнік Уладзімір Лайкоў, журналіст Міхась Мацельскі. Да працы спрычыніліся і супрацоўнікі вясковай бібліятэкі-музея народнай творчасці і побыту, Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева. У выданні размешчаны матэрыялы на дзвюх мовах — беларускай і рускай — тых, на якіх гавораць землякі-леваноўцы.

«Часам так хочацца быць бліжэйшай да сваёй зямлі, сваіх каранёў, але не заўсёды атрымліваецца. І вельмі добра, што ёсць такі дзень», — сказала на адным з мінулых свят Лілія Ананіч. Сярод старонак жыцця землякоў можна знайсці і яе ўспаміны пра бацькоў, настаўнікаў і вясковае жыццё.

«Сціскаецца сэрца. Няма на парозе роднай хаты бацькоў, апусцелі двары суседзяў. Няма школы — яна была «цэнтрам» сяла. У памяці — школьныя настаўнікі, святы ўраджаю, агляды-конкурсы ў раёне...

Ад сэрца да сэрца панясём памяць аб малой радзіме», — піша Лілія Ананіч у кнізе.

Заўтра землякі ў Леванове збяруцца ўжо пяты раз, першая сустрэча адбылася ў 2011 годзе. Кожны год на такія імпрэзы, дарэчы, прысвечаныя пэўнай тэматыцы, з'язджаюцца аднавяскоўцы, якіх раскідала па ўсіх кутках Беларусі і нават замежжа. Звычайнае месца сустрэчы — каля бібліятэкі-музея народнай творчасці і побыту. Мясцовыя, прыезджыя — амаль усе з сем'ямі. Музыка, усмешкі, размовы пра тое, што Леванова, на жаль, апусцела. А калісьці жыццё ў вёсцы проста кіпела! Не тое што цяпер — ці набярэцца сотня дамоў... Таму кніга стане сапраўдным гістарычным падарункам да 130-годдзя вёскі. Апроч прэзентацыі, тут чакаецца і канцэртная праграма. Было б добра, калі б такую традыцыю перанялі і іншыя беларускія вёскі, мо тады памяць пра іх захавалі б і наступныя пакаленні.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

ПТУШКА ШЧАСЦЯ: ВЯРТАННЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На паркет ступаеш з усёй адказнасцю: тэатр — гэта ж як храм, і вось ты ў ім. Храм — гэта нешта святое, дзе з табой гавораць пра самыя важныя рэчы. Жанчына з праграмкамі ўсіх вітае па-беларуску: калі ласка, кожны можа стаць удзельнікам конкурсу, калі намалюе сваё ўяўленне пра шчасце. Мамы кажуць: «Дзякуй!» Малыя пасміхаюцца, таму што ўжо разумеюць: шчасце — гэта тое, што патрэбна ўсім. І тут адразу ёсць прыклады таго, якое яно можа быць. Тата, мама, дзеткі (малому, здаецца, нават трох годзікаў няма), але ўсе разам прыйшлі ў тэатр. І яшчэ цікавыя госці: модны малады мужчына з голенай пад панка галавой і малы з такой жа стрыжкай, адразу відаць: тата і сыночак. Настаўніца з вучнямі — гавораць па беларуску. Пра паступленне ў гімназію, каму чаго чакаць. Мама з дзвюма дочкамі, пакуль чакаюць спектаклю, вырашылі пайсці на гукі раяля. Уздымаюцца па лесвіцы, азіраючыся вакол сябе. Мармуровыя поручні настройваюць на сур'ёзны лад. Але паміж паверхамі бачыш рэльеф з піянерамі — і адразу ўзгадваецца (прынамсі, дарослым, як я) той стары ТЮГ. Насамрэч тэатр з гісторыяй, якая пачыналася фактычна да Вялікай Айчыннай вайны, у 1931 годзе, а ў гэтым будынку ён пачаў сваё жыццё з 1956 года. Пра той час нагадваюць роспісы пад столлю ў фае. Але свежы паркет пад ёю падобны да дывана, сатканага з дробным малюнкам. Раяль, за ім піяніст — і гукі прыгожай класічнай музыкі навокал. Публіка, якая прыйшла на іх, пасела па баках фае. Але гэта пакуль, прыйдзе час — танцаваць на гэтым паркеце будуць. У цэнтры прадуманы кавалак падлогі, з якой на навагоднія святы будзе выязджаць ёлка. Цуд клопату пра свайго мэтавага гледача. І яшчэ клопат — у тэатры створана безбар'ернае асяроддзе, і паўнавартаснымі гледачамі змогуць адчуць сябе ўсе дзеці і дарослыя.

Цяпер пачынаецца новы адлік у адрамантаваным тэатры, дзе самыя галоўныя змены, бадай, тычацца ўсё ж такі большых магчымасцяў сцэны: каб яна магла трансфармавацца, лепш асвятляцца, мець дадатковыя тэхнічныя сродкі ў дапамогу мастакам-сцэнографам. І калі гэта ўсё чакалася доўга (тэатр некалькі гадоў існаваў на іншых пляцоўках), то шчасце для ўсіх, хто тут працуе, адчуць сябе дома. Дом стаў больш утульны і таму, што з'явіліся дадатковыя памяшканні — адміністрацыйна-вытворчы корпус, злучаны з галоўным будынкам тэатра.

Адкрыццё Тэатр юнага гледача — гэта свята, якое прываблівае і дарослых. Падлеткі (кажуць, складаны ўзрост), хлопцы з дзяўчатамі — ці не спатканне прызначылі ў тэатры? Завіталі ў буфет — тут усё як належыць: марожанае, пірожнае. Выбіраюць. А вось парачка ўжо нават сучасна-прасунутая, «айпадная», можа, студэнты (піражкі з капустай вельмі танныя!). На Метэрлінка ж дарослым схадзіць не заганна. Бельгійскі паэт і драматург, адзін са слупоў сімвалізму (які больш за сто гадоў таму вярэдзіў розумы), лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры, гаварыў з людзьмі пра вечнае, тое, што па-за матэрыяльным светам, але без чаго няма чалавека як жывой істоты. «Сіняя птушка» — адна з яго самых папулярных п'ес (яшчэ пры жыцці аўтара стала такой). Зразумела, чаму мастацкі кіраўнік Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача Уладзімір Савіцкі і рэжысёр пастаноўкі выбраў «Сінюю птушку» на адкрыццё ў сваім родным доме — і ў гэтым сімвалізм.

Цільціль і Міціль баяцца праспаць Каляды, калі здараюцца ўсе самыя галоўныя цуды. Ім дапамагае Фея: наладжвае дзецям падарожжа, праз якое яны лепш разумеюць тое каштоўнае, што ёсць у жыцці. Напачатку — што ўсё навокал — такое ж жывое. Любімы сабака мае душу, якая нарэшце размаўляе з гаспадарамі. Котка таксама мае душу, але ў яе сваё бачанне ролі чалавека ў свеце. Вада і агонь маюць душу. Цукар і хлеб — таксама. Як і Святло. Усе яны становяцца спадарожнікамі малых у пошуках птушкі шчасця, якая можа дапамагчы адной хворай дзяўчынцы.

Падчас свайго падарожжа дзеці сустракаюцца са сваімі дзядулем і бабуляй, якія цяпер у іншым свеце, але бачаць сваіх любімых унукаў кожны раз, калі тыя ўзгадваюць пра іх. Цільціль і Міціль бачаць шмат дзіўных рэчаў, шукаюць птушку шчасця сярод ночы і ў краіне дрэў — іх, дзяцей дрывасека, уражвае трагедыя, якую перажываюць дрэвы, губляючы сваіх братоў з-за людзей. Але яны бачаць і шчасце ў розных варыянтах (напрыклад, Самае Гладкае Шчасце), якое багата прапаноўвае жыццё. Але найбольш іх прываблівае Шчасце Матчынай Любові, якое раніцой наступнага дня яны пачнуць цаніць яшчэ больш. Вось толькі птушку знайсці цяжка. Тую фантастычную Сінюю птушку, пра якую казала Фея. Але часам так бывае, што яна зусім побач — тая самая твая любімая птушачка, якая жыве ў клетцы, а нехта тым часам марыць пра такую ж. Птушка шчасця насамрэч жыве дома. Яна там, дзе ты. А шчасце ў тым, што ты можаш ім дзяліцца з іншымі.

Метэрлінк атрымаўся не столькі сімвалічны, колькі сапраўды казачны — з прыгожымі яркімі касцюмамі, песнямі (кампазітар Сяргей Бельцюкоў) і вершамі (паэт Алесь Бадак). У дзіцячым тэатры інакш гэтую п'есу зрабіць было б складана — а тут варыянт, які быў бы цікавы і бацькам, і дзецям. Нягледзячы на тое, што ўзроставая аўдыторыя спектакля вызначана як «10+», у зале была малеча годзікаў нават ад 3-х — яе прываблівала дзея, калі нешта на сцэне хутка мянялася, выязджала ці наадварот, знікала, зіхацела ці хавалася ў туман. У некаторыя моманты дзеянне праходзіла праз залу, уцягвала гледачоў (праз гульню з шарамі, напрыклад). А можа, заварожвала беларуская мова, на якой прадстаўлялі Метэрлінка. Спадабалася і дарослым, і дзецям. Дарэчы, гучней за ўсіх «брава» крычалі важныя таты. Гэта тэатр усё ж сямейны. Тэатр як дом. Тэатр дома.

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Нотны радок

ПАЧУЦЬ АГІНСКАГА — І ЖЫЦЬ ДАЛЕЙ

Найбольш вядомы твор Міхала Клеафаса Агінскага здаецца вяршыняй беларускага суму. Але яго аўтар не быў сумным чалавекам з сумным жыццём. Пра гэта збіраюцца расказаць на канцэрце да 250-годдзя неабыякавага чалавека і таленавітай асобы, якая можа натхняць на развіццё нашу сучасную культуру.

5 чэрвеня ў Белдзяржфілармоніі, у малой зале імя Рыгора Шырмы, адбудзецца адзіны канцэрт «Музычныя скарбы Агінскіх» з фестывалю, які запланаваны на ўвесь юбілейны для Міхала Клеафаса Агінскага год. Асноўная частка імпрэз адбываецца ў Залескай сядзібе. Але сталіца не застаецца ўбаку.

Сённяшні канцэрт адметны тым, што разам з музыкай часу Агінскага і прадстаўнікоў гэтага роду створаны магчымасці лепш зразумець жыццё чалавека, які быў шчодра адораны рознымі талентамі. Грамадскі дзеяч і дыпламат, інтэлектуал і творца па натуры, ён пакінуў пасля сябе столькі загадак (разгадваць іх дапамагае даследчыца Святлена Немагай, якая забяспечвае навуковы каментар канцэрта), столькі адкрыццяў для нас — у выглядзе твораў, якія яшчэ можна адшукаць. І ў гэтым музычныя сенсацыі вечара, падрыхтаванага ансамблем салістаў «Вытокі» на чале з лаўрэатам міжнародных конкурсаў Аляксеем Фраловым. У гонар Агінскага сёння выступаюць таленты сучаснай беларускай музыкі, чыё майстэрства адзначана на прэстыжных міжнародных конкурсах, у прыватнасці, тэнар Юрый Гарадзецкі, піяніст Аляксандр Музыкантаў, кларнетыст Дзяніс Парэчын; гістарычны фон дапаможа стварыць ансамбль старадаўняй музыкі «Брэвіс».

Ларыса ЦІМОШЫК

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV@R

Алена ДАМІЕВА:

«ЛЮБЛЮ ЖЫЦЦЁ ВА ЎСІХ ПРАЯВАХ»

Ад памылак ніхто не застрахаваны, але не пабаяцца рызыкнуць і стаць шчаслівай — на такое адважваецца не кожны. Наша гераіня — прыклад чалавека, які ніколі не марыў быць у кадры і ўсё ж пятнаццаць гадоў таму зрабіў крок насустрач нязведанаму. Сёння яна — рэдактар і вядучая тэлерадыёкампаніі «Брэст». Алена Даміева — прафесіянал, здольны канкураваць на тэлевізійнай прасторы, што пацвярджаецца прызавымі месцамі на «Тэлевяршыні» розных гадоў, а таксама сёлетняй узнагародай «Залатое пяро» ў намінацыі «За найлепшы цыкл работ у радыё- і тэлежурналістыцы». Мы паспрабавалі даведацца ў вядучай тэлепраектаў «Зразумець і абясшкодзіць», «Пад грыфам «Знакамітыя» (выходзяць на «Беларусь 2»), што паўплывала на выбар прафесіі, без каго быў бы немагчымым сённяшні поспех і чым ён вымяраецца...

— Кажуць, добра там, дзе нас няма...

— Мне добра там, дзе я ёсць. Трэба ўмець знаходзіць станоўчае ў сваім часе, у сённяшнім дні. Гэта больш важна, чым думаць, што недзе ў іншым месцы, табе будзе лепш. Я зразумела, што мне добра ў Брэсце. Побач — мае родныя і блізкія, у мяне выдатны калектыў, і я займаюся любімай справай. Бываю там, дзе ёсць магчымасць параўноўваць... Проста радуюся таму, што маю. Для мяне галоўнае — рабіць сваю справу як належыць. Зусім не прынцыпова, дзе ты знаходзішся пры напісанні, напрыклад, чарговага сцэнарыя. Праграмы мае выходзяць у тым ліку і на буйных тэлеканалах нашай краіны. Нас глядзяць, з намі супрацоўнічаюць. І калі паўторна звяртаюся да некага са сваіх герояў з прапановай зрабіць матэрыял, то мне не адмаўляюць. Атрымліваецца, давяраюць. А значыць, мы робім сваю працу правільна.

18.50 Камедыя «Помста сябровак нявесты».

20.20 Камедыя «Чалавек-Эльф».
23.10 Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі».
1.15 Камедыя «Дыска».
4.00 Камедыя «Каханне з перашкодамі».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.30 «Нераскрытыя тайны».
11.25 «Prokіно».
11.35 «Хронікі маскоўскага побыту».
12.25 «Гісторыі выратавання».
13.00, 1.25 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
16.45 М/ф «Тры волаты на далёкіх берагах».
17.55 «Без тэрміну даўнасці».
18.50, 4.40 Дак. фільм «Жыццё на пантах».
20.20 Маст. фільм «Пацалунак матылька».
22.15 Маст. фільм «Прадчуванне».
23.55 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.10 Баявік «Агент пад прыкрыццём».

7.50 Драма «Куды прыводзяць мары».
9.50 Баявік «Напруж звіліны».
11.40 Драма «Лекар: Вучань Авіцэны».
14.20 Драма «Лінкальн для адваката».
16.20 Камедыя «Па прыкметах сумяшчальнасці».
17.50 Драма «Джобс: Імперыя спакусы».
20.00 Камедыя «Справа ў табе».
21.30 Камедыя «1+1».
23.30 Драма «Паляванне».
1.30 Драма «Марыя-Антуанета».
3.40 Прыгоды «Трыстан і Ізольда».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Трагікамедыя «Аддаць канцы».
8.05 Камедыя «Нянькі».
9.45 Прыгоды «Прыватнае піянерскае».
11.30 Камедыя «Дублёр».
13.00 Камедыя «Мільён у шлюбным кошыку».
14.35 Меладрама «Яшчэ адзін год».
16.30 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
18.10 Драма «Неба паўшых».
20.20 Трылер «Уцёкі».
22.30 Трылер «Вій 3D».
0.30 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
2.05 Меладрама «Начной карчмы агеньчык».
4.20 Камедыя «Бакенбарды».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Мегазаводы.
6.45 Зрабі або памры.
7.10 Гульні розуму.
7.30, 10.10 Папулярная навука.
7.55 Код небяспекі.
8.40 Космас: Прастора і час.
9.25 Навука будучыні.
10.55, 5.15 Навуковыя недарэчнасці.
12.30 Больш чым фокусы.
13.15 Гісторыя ежы.
14.00 Дзень «Д».
14.45 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
15.35 Тайнае жыццё драпежнікаў.
16.20 Паляванне за рачной пачварай.
17.10 Марское ўзбярэжжа.
17.55 Saxon Gold: New Secrets Revealed.
18.40, 22.30, 2.15 Камета Ісон.
19.30, 23.15, 3.00 Сутыкненне з астэроідам.
20.15 Маманцяня: Застылы ў часе.
21.00, 0.45, 3.45 Тыраназаўр: чэмпіён па выжыванні.
21.45, 1.30, 4.30 Больш, чым тыраназаўр.
0.00 Цуда-юда дыназаўры.

DISCOVERY

8.00, 17.10, 5.36 З любові да машын.
8.50, 15.30 Хуткія і гучныя.
9.40, 16.20, 0.40, 6.24 У пагоні за класікай.
10.30 Рэальныя дальнабойшчыкі.
11.20 Залатая ліхаманка.
13.00, 4.00 Скарбы з каморкі.
13.50, 23.50 Склады.
14.40 Стальныя хлопцы.
18.00 Дамы на дрэвах.
18.50 Ванная пад ключ.
19.40 Акварыумны бізнес.
20.30 Трой.
23.00 Рыбацкія легенды.
1.30 Рукатворныя цуды.
2.20 Перш за ўсё — самалёты.
3.10 Аэрапорт знутры.
4.48 Як гэта ўстроена?
5.12 Як гэта зроблена?
7.12 Праз магію да зорак.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

БЛІЦ-67

Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў) працягвае свой конкурс заданнем **№ 2:**



Белыя: b6, d6, дамка b8 (3). **Чорныя:** a5, b4, d4, e3, f6, h8 (6). Выйгрыш.

Як паведаміў карэспандэнт рубрыкі Пётр Шклудаў (Наваполацк), у ЧРБ-17 па шашачнай кампазіцыі-100 Д. Камчыцкі заваяваў у раздзелах эцюдаў і дамачных праблем адпаведна сярэбраны і бронзавы медалі. Разгледзьце па-за конкурсам яго найлепшыя творы:



1. **Белыя:** 29, 33, 44, дамкі 2, 47 (5). **Чорныя:** 10, 20, 22, 32, дамка 49 (5). **5,125 ачка па змесце:** 29-24 (38) 27 (21А) 35, 16+. А (35) 48+.

2. **Белыя:** 12, 22, 46, дамкі 1, 21 (5). **Чорныя:** 7, 13, 31, 32, 37, 38, 41, дамка 10 (8). **5,5 ачка:** 18, 26, 27 (21А) 5 (42) 37, 41+. А (31) 41, 5+.

о о о

Адказы і заўвагі на працягу двух тыдняў накіроўвайце на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

РАШЭННІ

Бліц 66-6 (П. Шклудаў): I g5, b4 (f8) e7, h8, hf6, f8, f4, b6, a1(b6A) d4 (a5) c3 (g5) d2 (h4) e1+. A(g5) d4 (f4/h4) f2+.

I h8? (c5) b4 (g7) f8 (c5) II e1, III g5, d2 (g1) g3 (c3)=. II a1?, d8 (c1) c3 (d4) b8 (e1) d4 (h4) g3 (a7)=. III de7? (ae5) b6, a3 (h8) c1 (b6) g5, d2 (g1)=.

З канструкцыяй і папярэднімі заданнямі справіліся: І. Карпыза (Ляхавічы), А. Камінская (Вілейка), С. Нячаеў (Баранавічы), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), І. Ананіч (Гродна), І. Працук (Паставы), М. Трухан (в. Пагост Салігорскага раёна), У. Валчкоў (Маладзечна), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), А. Белы (Наваполацк), А. Пярхальскі (Глыбокае), В. Варушыла, У. Есмантовіч, А. Літвінаў, В. Логвінаў і В. Шульга з сынам Піліпам (Мінск).

Бліц-65/6 дапускае прыватнае пабочнае рашэнне: 1. fe3 d:f4 (так мацней) 2. g:e3 d:f2 3. b:f6 e:g5 4. a:e7 h:f6 5. h:f4 fe1 6. fg5 f:h4 7. gf2 e:g3 8. h:f4x. Да мэты вядзе і 5. g:e3 gh4 6. ed4 ab6 7. ab2 fg5 8. h:f4 hg3 9. dc5 b:d4 10. fe5 d:f6 11. h:f4x. Убачылі Ігар Ананіч, Аляксандр Белы і інш. Сярод іх пераможцам прызнаны Віталь Варушыла, чый адказ быў самым змястоўным і аператыўным. Аўтар конкурснай пазіцыі і дабрадзей бліца-65 Віктар Шульга ўручыў яму кнігу ўкраінскіх праблемістаў А. Малюты і А. Баланюка «Узоры шашачных камбінацый».

■ У свеце жывёл

Дарагія гадаванцы 2

За апошнія пяць гадоў у Еўропе хатнія сабакі і кошкі сапсавалі розных гаджэтаў на суму 1,5 мільярда фунтаў (2,1 мільярда еўра). Такія звесткі прыводзіць брытанскае выданне Mirror.

Самымі разбуральнымі з'яўляюцца чатырохногія ўлюбёнцы брытанскіх сем'яў, якія нанеслі гаспадарам шкоду ў палову мільярда еўра. Яны ламаюць тэлефоны, планшэты і наўтбукі ў 14% дамоў у Вялікабрытаніі. Як паведамляецца ў дакладзе, асноўная прычына пашкоджанняў у тым, што сабакі і кошкі прымаюць гаджэты за свае цацкі і грызуць іх, губляюць, разліваюць на іх вадкасці, скачуць па іх. Для правядзення даследавання кампанія апытала 16 000 уладальнікаў хатніх жывёл.

Lamborghini для ката

Канадскі дыджэй Deadmau5 набыў для свайго ката аўтамабіль Lamborghini. Жывёліна па мянушцы Прафесар Мяуінгтанс будзе катацца на мініяцюрнай версіі суперкара.

Як адзначаюць СМІ, некаторыя знакамітасці вядомыя тым, што дораць экзатычныя машыны сваім дзецям, але Deadmau5 стаў першым, хто купіў індывідуальны транспартны сродак хатняй жывёле. Кошт набыцця не ўдакладняецца. Канадскі прадстаўнік шоу-бізнесу з'яўляецца вялікім прыхільнікам суперкараў і да куплі Lamborghini для ката паспеў запоўніць свой гараж разнастайнымі мадэлямі аўто. 34-гадовы Deadmau5 (сапраўднае імя Джоэль Томас Цімерман) — дыджэй і музычны прадзюсар.

Гэтага лася не прапусціш

Гіганцкае парнакапытнае, створанае нарвежскай мастачкай Ліндай Бака, стаіць паміж Осла і Транхеймам.

Статуя пад назвай Вялікі Лось з'яўляецца часткай праекта нарвежскай дарожнай адміністрацыі, у рамках якога мастацтва заклікана дапамагчы зменшыць колькасць ДТЗ. «Ідэя заключаецца ў тым, каб людзі спыняліся і выходзілі паглядзець на лася, адначасова размяць ногі і трохі адпачыць на свежым паветры», — тлумачыць Лінда Бака. Акрамя таго, гэты лось будзе нагадваць кіроўцам аб небяспеках дзікай прыроды, а таксама парушаць манатоннасць іх паездкі.

Лось зроблены з паліраванай сталі. Карысны арт-аб'ект прыбыў у Нарвегію з Кітая, дзе яго было танней вырабіць. Вялікі Лось будзе афіцыйна намінаваны ў Кнігу рэкордаў Гінэса. «Нарвежац» павінен па сваіх памерах перасягнуць Mac the Moose — скульптуру амерыканскага лася, усталяваную яшчэ ў 1984 годзе ў канадскім горадзе Мус-Джоў. Вышыня канадскага экзэмпляра — 9,8 метра, а вага — 10 тон, параметры нарвежскага канкурэнта пакуль не раскрываюцца.

Іван КУПАРВАС

НЯДЗЕЛЯ, 14 ЧЭРВЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.15 Камедыя «Загадана ажаніць». 1-я і 2-я серыі.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40, 0.40 Камедыя «Кухня».
10.45 «Пра ежу!».
11.25 XXL WOMAN TV.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Зона Х. Вынікі тыдня.
13.05 Тайны следства.
13.40 Каробка перадач.
14.15 Вакол планеты.
15.15 Твой горад.
15.30 Меладрама «Не сыходзь». 2-я серыя.
17.20 Нашы.
17.35 Меладрама «Каханне нечаканае нойдзе». 1—4-я серыі.
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.15 Дыялогі пра цывілізацыю.
22.45 Меладрама «Атэль для Папялушкі».
23.45 Футбол. ЕЎРА-2016. Кваліфікацыя. Агляд гульнявога дня.
0.15 Першыя Еўрапейскія гульні ў Баку-2015.

БЕЛАРУСЬ 2

6.55 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
8.10 Серыял «Шчаслівыя разам».
10.00 Я хачу гэта ўбачыць!
10.35, 20.05 Тэлебарометр.
10.40 «Зразумець і абясшкодзіць».
11.20 Ваша лато.
11.50 Латарэя «Пяцёрачка».
12.00 Хачу ў тэлевізар!
12.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».
14.05 Камедыя «Сужэнцы Морган ва ўцёках».
15.55 Баявік «Каманда-А».
18.00 «Comedy woman».
19.15 Суперлато.
20.40 Кіпень.
21.00 Рэальны свет.
21.35 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
21.45 Футбол. ЕЎРА-2016. Кваліфікацыя. Беларусь — Іспанія.

БЕЛАРУСЬ 3

7.55, 11.50, 16.25, 0.10 Калейдаскоп.
8.05 «Імперыя. Пачатак». Драма. Фільм першы «Царэвіч Аляксей». Часткі 1-я і 2-я.
9.50 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Кацярына Пытлева.
10.30 «Наперад у мінулае».
10.55, 21.05 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
12.00, 21.55 «Пацалунак Сакрата». Серыял. Фільм другі «Каралі Неферціці». 1-я і 2-я серыі.
13.35 «Музеі Беларусі». Музей гісторыі горада Мінска.
14.05 «Скачок у волю». Драматычны спектакль тэатра Сяргея Янкоўскага. Часткі 1-я і 2-я.
15.35 «Вяртанне Міхася Забэйды». Дак. фільм.
16.35 «Звычайны злачынца». Камедыя.
18.05, 23.35 «Культпрасвет».
18.40 «Казус Бэлі». Камедыя.
20.45 Калыханка.

БЕЛАРУСЬ 5

3.55, 6.25, 20.55, 22.50 Футбол. Чэмпіянат свету. U-20. Чвэрцьфінал.
5.55, 1.00 PRO спорт. Навіны.
6.10, 0.45 Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Вынікі дня.
8.25, 11.10, 13.45 Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Веславанне на байдарках і каноэ.
10.00 Пляжны футбол. Еўралігa. Беларусь — Польшча.
12.20 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Беларусь — Турцыя.
15.55 Гандбол. Адборачны матч ЧЕ-2016. Беларусь — Літва.
17.35 Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Грэка-рымская барацьба.
19.40 Пляжны футбол. Еўралігa. Расія — Беларусь.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.40 «Фазэнда».
11.15 Да юбілею мастака. «Ілья Глазуноў. Лесвіца адзіноты».
12.20 Серыял «Шлюб па завяшчанні. Вяртанне Сандры».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Тэорыя змовы».
17.15 «Кропля ў кроплю». Лепшае.
20.00 Контуры.
21.05 «Вызваленая Еўропа».
22.00 «Што? Дзе? Калі?».
23.10 «Містэр і місіс СМІ».

23.45 Маст. фільм «Дачка».

СТБ

6.00 Серыял «Студэнты International».
7.15 «Скардзіцца дазволена».
7.35, 16.50 «Аўтапанарама».
8.00 Маст. фільм «Мумія: Прынц Егіпта».
10.10 «Чыстая праца».
11.00 «Вялікае снеданне».
11.40 Серыял «Салдаты 2».
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
13.40, 0.15 Маст. фільм «Сінг-Сінг».
15.45 «Дарагая перадача».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.20 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
20.25 Маст. фільм «Фатальны лік 23».

22.15 «Зорны рынг».
23.20 «Масква. Дзень і ноч».

МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15, 13.30 М/ф.
7.10 Маст. фільм «І не засталося нікога».
9.05 «Ведаем рускую».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 Маст. фільм «Марозка».
11.50 Маст. фільм «Стары Хатабыч».
14.15 Маст. фільм «Беражыся аўтамабіля».
16.15 Маст. фільм «Пакроўскія вароты».
18.45, 22.25 Серыял «Секунда да...».
21.00 «Разам».
23.20 Маст. фільм «Парк савецкага перыяду».
1.45 Дак. серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».
4.40 Маст. фільм «Вяселле».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Ха».
7.40 Маст. фільм «Хатняя прыслужніца».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 «Смехапанарама».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 М/ф.
14.15 «Расія. Геній месца».
15.10 Маст. фільм «Настаўнік спеваў».
16.40 «Смяяцца дазваляецца».
18.05 «Жывы гук».
20.00 Весткі тыдня.
21.50 Камедыя «Ідэальная пара».
23.40 «Нядзельны вечар».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.10, 8.20 Серыял «ППС».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Медыцынскія тайны».
9.25 «Ядзім дома».
10.20 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
13.20 «Я худзею».
14.15 Серыял «Каця».
16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
18.05 Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
19.00 «Сёння. Вынікавая праграма».
20.00 Дэтэктыў «Распалены перыметр».
23.15 «Спіс Норкіна».

8 КАНАЛ

9.00, 15.15, 19.20, 21.00 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.35, 13.05, 17.25, 20.55 «Хатняя крама».
10.50, 23.30 «Хобі TV».
11.40 «Залатое стагоддзе», Дзіна Дурбін у фільме «Тры мілыя дзяўчыны».
13.15 Баявік «Зорны дэсант».
15.20 Трылер «Зорны шлях».
17.55 Серыял «Каломба».
19.25 Меладрама «Адна сустрэча».

20.45 «Вечарніца».
21.05 Драма «Джоні Д».

ВТВ

6.00, 6.00 «PLAY».
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
8.00, 15.30 «Ералаш».
9.00 Серыял «Вароніны».
10.00, 2.00 «Турбаміксер».
12.00 Серыял «Сямейны бізнес».
13.30 «Паспець за 24 гадзіны».
14.30 «Рублёва — Бірулёва».
16.00, 1.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
16.30 Камедыя «Джунглі кліч-чуць! У пошуках Марсупілямі».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 «Ленінградскі Stand-up клуб».
21.30 Фэнтэзі «Іншы свет».
0.00 Скетчком «Студэнты».
0.30, 4.30 «Лаві момант».
1.00 «Нерэальная гісторыя».
5.00 Серыял «Калыска над бездонню».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.30 П.І. Чайкоўскі. «Поры года. Чэрвень» («Баркарола»).
10.40 «Караблі штурмуюць бастыёны». Маст. фільм.
12.10 «Больш, чым каханне». Алена Кузьміна і Міхаіл Ром.
12.50 П.І. Чайкоўскі. «Поры года. Ліпень» («Песня касца»).
13.00 «Жывое слова».
13.40 «Шлях да прычала». Маст. фільм.
15.05 П.І. Чайкоўскі. «Поры года. Жнівень» («Жніво»).
15.10 Рудольф Бухбіндзер, Зубін Мета і Венскі філарманічны аркестр у канцэрце «Летнім вечарам у палацы Шонбрун».
16.45 П.І. Чайкоўскі. «Поры года. Верасень» («Паляванне»).
16.50 «Шукальнікі». «Тайна згубы чырвонага фабрыканта».
17.35 П.І. Чайкоўскі. «Поры года. Кастрычнік» («Восеньская песня»).
17.45 «Рамантыка раманса». «Песня застаецца з чалавекам...».
18.40 П.І. Чайкоўскі. «Поры года. Лістапад» («На тройцы»).
18.50 «Дзіўная жанчына». Маст. фільм.
21.10 П.І. Чайкоўскі. «Поры года. Снежань» («Каляды»).
21.15 Залатая калекцыя «Зіма—Лета 2015».
0.05 «Поспех». Маст. фільм.
1.35 «Леў і 9 гіен». «Павольнае бістро». М/ф для дарослых.
1.55 «Дэльфіны схаванай камерай». Дак. фільм. 2-я серыя.
2.50 «Рафаэль». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 12.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1965-ы. Паўтор ад 7.10. 2009 года.
7.05, 8.40, 9.40, 11.00, 13.00, 14.25, 15.50, 17.10, 18.40, 19.55, 22.30, 0.05, 2.05, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.20 Маст. фільм «Бывайце, фараоны!».
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
11.30 «Атланты трымаюць неба». «Драўляныя гарады».
13.20 «Мы Вас любім!». Канцэрт групы «Воскресенье». 1994 год.
14.45 М/ф «Машанькін канцэрт».
15.00 «Быў час». 2009 год.
16.10 Маст. фільм «Па вуліцах камоду вадзілі».
17.40 М/с «Болек і Лёлек».
18.00 «Акулы пяра». Група «Карозія металу». 1997 год.
19.00, 4.00 «Нарожданыя ў СССР».
20.25 М/ф «Царэўна-Жаба».
21.00 Маст. фільм «Гарадскі раманс».
23.40, 5.40 М/с «Прыгоды Рэкса».
0.00 «Прэс-экспрэс» .1995 год.
1.00 Маст. фільм «У адно адзінае жыццё».
2.40 М/ф «Браты Лю».

EUROSPORT

4.00, 10.00, 20.30 Аўтагонкі. Гонка «24 гадзіны Ле Мана».
9.30, 16.15 Аўтагонкі.
16.45, 23.00 Веласпорт.
18.00 Тэніс. Турнір ATP. Фінал.
19.00 Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
20.00 Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно.
21.30 Аўта- і мотаспорт.
21.45, 22.55 Конны спорт.
21.50 Конны спорт. Каны.
0.00 Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Англія — Мексіка.
1.00 Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Бразілія — Іспанія.
2.00 Футбол. Старэйшая ліга футбола. «Orlando City SC» (ЗША) — «Дзі Сі Юнайтэд» (ЗША).

КАМЕДЫЯ

6.00, 3.20 Серыял «Пэт і Кэбедж».
6.45 Камедыя «Снежная нявеста».
8.10 Камедыя «Неўпапад».
9.40, 17.45 Серыял «Татка».
10.35 Камедыя «Двое — гэта занадта».
12.30 Камедыя «Помста сябровак нявесты».
14.00, 20.05, 0.50 Скетчком «Паміж намі».
14.20 Камедыя «Купі, займі, выкрадзі».
16.00 Камедыя «Джунглі кліч-чуць! У пошуках Марсупілямі».
18.40 Камедыя «Чалавек-Эльф».
20.20 Камедыя «Два ў адным».
22.00 Серыял «Я і місіс Джонс». 1 і 2 серыі.
23.10 Баявік «Кілеры».
1.15 Камедыя «Усмешка Бога, ці Чыста адэская гісторыя».
4.10 Камедыя «Дыска».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.25 «Нераскрытыя тайны».
11.20 «Паненка і кулінар».
11.55, 1.45 Серыял «Тайны следства». Заключныя серыі.
15.15 «Сто пытанняў даросламу».
16.00 «Жонка. Гісторыя кахання».
17.20 «Без падману».
18.10, 4.40 Дак. фільм «Шкельца за мільён».
19.45 «Доказ віны».
20.30 Маст. фільм «Тэльма і Луіза».
22.50 «Асцярожна, махляры!».
23.20 «Часова даступны».
0.15 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.00 Дэтэктыў «Начны цягнік да Лісабона».
7.50, 15.45 Драма «Марыя-Антуанета».
9.55 Драма «Басанож па смаўжах».
11.45 Камедыя «Справа ў табе».
13.15 Прыгоды «Галодныя гульні: І ўспыхне полымя».
17.50 Камедыя «Закаханы Шэкспір».
20.00 Фантастыка «Дывергент».
22.20 Баявік «Прафесіянал».
0.20 Трылер «Без кампрамісаў».
2.00 Жахі «Воўк».
4.10 Камедыя «Сем псіхапатаў».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Мільён у шлюбным кошыку».
8.30 Меладрама «Унук Гагарына».
10.20 Фэнтэзі «Рэальная казка».
12.20 Драма «Ты ў мяне адна».
14.10 Трылер «Уцёкі».
16.20 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
18.00 Трылер «Вій 3D».
20.20 Камедыя «Нерэальнае каханне».
21.50 Баявік «22 хвіліны».
23.20 Камедыя «Аднакласнікі. ru: НаCLICKай удачу».
1.05 Меладрама «Яшчэ адзін год».
3.00 Драма «Агні прытона».
4.55 Драма «Жанаты халасцяк».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Мегазаводы.
6.45 Зрабі або памры.
7.10 Гульні розуму.
7.30 Займальная навука.
7.55, 18.40 Код небяспекі.
8.40 Космас: Прастора і час.
9.25, 22.30, 2.15 Навука будучыні.
10.10 Папулярная навука.
10.55, 5.15 Навуковыя недарэчнасці.
12.30 Больш чым фокусы.
13.15 Гісторыя ежы.
14.00 Дзень «Д».
14.45 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
15.35 Тайнае жыццё драпежнікаў.
16.20 Тайны гуансійскіх пячор.
17.10 Дзесятка лепшых фотаздымкаў.
17.55 Выкраданне месяцовага каменя.
21.00, 0.45, 3.45 Праект: Дыназаўр.
21.45, 1.30, 4.30 Смяротны бой дыназаўраў.
23.15, 3.00 Голая навука.
0.00 Маманцяня: Застылы ў часе.

DISCOVERY

8.00 Скарбы з каморкі.
8.50, 2.20 Стальныя хлопцы.
9.40 Склады.
10.30 Рукатворныя цуды.
11.20 Аэрапорт знутры.
12.10, 3.10 Аляска: сям'я з лесу.
13.00 Выжыць разам.
13.50 Акварыумны бізнес.
14.40 Ванная пад ключ.
15.30, 22.10, 1.30 Хуткія і гучныя.
16.20, 23.00 Пякельная паездка.
17.10, 23.50, 5.36 Праз магію да зорак.
20.30 Залатая ліхаманка.
0.40 Рэальныя дальнабойшчыкі.
4.00 Аляска: апошні рубеж.
4.48 Як гэта ўстроена?
5.12 Як гэта зроблена?



НАВОШТА ГРОШЫ Ў ЛУЗЕ?

«Кляновы лісток на планеце Зямля» — наша краіна і сапраўды вельмі невялікая. Як здавалася б, ні ў народзе, ні ў прыродзе вялікіх адрозненняў быць не павінна. Але ж...

Сама я родам з-пад Навагрудка. Разам з сёстрамі расла там пад крылом у бацькоў, вучылася, працавала. Але, відаць, лёсам было наканавана перабрацца на Брэстчыну, бо менавіта сюды мяне паклікалі замуж.

Дык вось. Неяк летам падаліся мы ў госці да бацькоў майго мужа. А пара была гарачая, сенакосная. Свёкар на кані збіраўся ў луг па гатовае сена. Мы з мужам падрадзіліся яму дапамагчы — з ахвотай селі ў воз.

Яшчэ па дарозе я заўважыла, што вязём мы нейкія жэрдкі, але ж ляжаць яны — і няхай ляжаць, распытваць пра іх не стала.

Тым часам дабраліся да месца, мужчыны распрэглі каня, каб ён крыху падсілкаваўся ды адпачыў, свёкар пачаў тупаць ля воза. Узяў тыя жэрдкі-перакладзіны, дзве з іх палажыў спераду, дзве ззаду ўпоперак воза, дзве — па краях і ўздоўж. Адну — круглую, велікаватую — адкінуў чамусьці ўбок.

Я зноў жа не зразумела, што тут да чаго, хоць на лузе была не ўпершыню. З родным бацькам мы не раз і касілі там, і сушылі, і звозілі гатовае сена. Але ж тады проста складалі яго ў воз, потым зверху, каб па дарозе не трэслася, прыціскалі доўгай жэрдкай ды ўвязвалі вяроўкай...

Свёкар між тым скончыў сваю тупаніну і, узброіўшыся вілами, стаяў у возе, казаў, каб мы з мужам падавалі сена. Гэта — і зноў жа для нас абаіх — было не ў навіну: мы стараліся, і воз наш рос: і ў шырыню, і ў даўжыню, і ў вышыню.

На зямлі нарэшце амаль нічога не засталося, хіба драбяза. Муж пайшоў па каня. Мне даручалася ўсё падгрэбці ды закінуць на воз.

— Падай рубля! — загадвае адтуль свёкар.

А я ж, едучы на луг, грошай з сабой не брала — навошта?

Кажу яму, што рубля няма. А самой — хоць ты скрозь зямлю праваліся, бо чалавек жа можа падумаць, што мы без капейкі жывём альбо я шкадую яму.

Думаю так, а мужаў бацька сваё гне:

— Давай рубля... Дзе ж ён падзеўся?

І муж, як на ліха, далекавата адышоў. Можа, думаю, у яго з сабой грошы ёсць? А ў мяне — свёкру яшчэ раз кажу — ні капейкі з сабою....

Толькі тады ён, мусіць, здагадаўся, у чым затрымка, ды падказаў, што рубель у мяне перад носам ляжыць...

А тут і муж падышоў, разам мы падалі бацьку таго «рубля». Адзін канец яго, драўлянага, мужчыны прывязалі вяроўкай спераду, другі — ззаду. Атрымаўся шырокі, высокі і вельмі ўстойлівы воз.

А я да таго ж увачавідкі ўбачыла, наколькі праўдзівыя нашы прымаўкі «Што ні край, то свой звычай» і «Што галава, то розум».

Лілія СКІНДЗЕР,

г. Івацэвічы.

ПРАПАЖА І ЗНАХОДКА

...Моды садзіць зімні часнок у мяне раней не было — два гады як з'явілася: суперэлітнага насення даў адзін чалавек, вельмі ж хацеў аддзячыць!

А пачалося ўсё так. Аднойчы паехала я ў блізкі лес (па-нашаму Прагон) свае грыбныя мясціны праверыць: можа, думаю, пашчасціць назбіраць там любімых баравікоў ды рыжыкаў. Калі трапляюцца, дарэчы, я яшчэ абабкі бяру, падасінавікі ды позна ўвосень — жаўтушкі. Усё астатняе, што людзі збіраюць, для мяне «вужаўкі» (па-нашаму — дрэнныя грыбы).

Ну дык, значыць, сабрала я свой ураджай, стала збірацца дадому. Гляджу — каля самай дарогі стаіць вядро з грыбамі, а па ўскрайку ходзіць наш лучынскі мужык ды ў кусты зазірае.

Павіталіся мы. Пытаю:

— Што ты шукаеш?

— Ды, — кажа, — веласіпед знік: з паўгадзіны таму пад дрэва паставіў — і няма. Няйначай, нехта забраў?!

Пабедавалі мы з Валодзем, разам паабураліся тым, які «свет пайшоў», ужо ўдваіх пашукалі прапажу — як карова языком злізала!

— Можа, у іншым месцы паставіў? — пытаю ў чалавека.

— Не, — кажа, — тут. Я дакладна помню.

Не ў гуморы ён, бедны, быў — яшчэ і ад таго, што курнуць дужа хацелася, а цыгарэты з запалкамі ў пакеце на багажніку засталіся.

Ну што тут будзеш рабіць? Валодзя застаўся ў лесе, я падалася дамоў. І пра гэту сустрэчу, можа, забылася б, але ж дні праз два зноў паехала ў лес. І рада: на маіх мясцінках баравічкі павылазілі... Ды такія... Трэба зняць (у лес я заўсёды з фотаапаратам хаджу)!.. Потым гэты цуд прыроды акуратненька зрэзаць, а грыбніцу ігліцай прысыпаць...

І яшчэ (прабачце, справа жыццёвая) адна патрэба ў мяне з'явілася — зусім невялічкая. Выбрала я месцейка (метраў за 40 ад таго, дзе надоечы сустрэла Валодзю), зайшла за кусцікі, прысела... І раптам — веласіпед! Перад саменькім носам!

Падскочыла, як на катапульце, перакруцілася, войкнула, бо радыкуліт стрэліў проста ў паясніцу, і, сагнуўшыся літарай «г», стала ўзірацца ў кусты, ці няма там каго?

Не, дзякуй Богу, нікога... «І цішыня».

Забыўшыся пра патрэбу, прывяла сябе ў парадак, падышла да веласіпеда. На багажніку, бачу, пакет. Разгарнула — там цыгарэты з запалкамі, па якіх бедаваў Валодзя...

Яго самога, у той час, ні паблізу, ні дома не аказалася. Таму веласіпед з лесу мы прывезлі на машыне з ягоным сынам Раманам.

...Гаспадар ну вельмі рады быў, што знайшлася яго прапажа, — абяцаў мне самую вялікую шакаладку купіць. Але я адмовілася, бо людзям памагаць трэба бескарыслівa, як гэта робіць ён...

Тады Валодзя паабяцаў мне свае грыбныя мясціны адкрыць, але і ад гэтага я адмовілася. А нарэшце ён прынёс на развод насенне суперэлітнага зімняга часнаку. Не ўзяць яго было б непрыгожа. Таму і саджу цяпер, нават з добрымі людзьмі дзялюся.

А вось у лес ісці ўжо трохі страшнавата. Кажуць, з пэўнымі мэтамі там відэакамер навешалі. Паспрабуй прысядзь пад куст... Во рогату назіральнікам будзе!

Соф'я КУСЯНКОВА,

в. Лучын, Рагачоўскі раён.

УСЁ БУДЗЕ ЯК БУДЗЕ...

Камандзіровак ды розных падарожжаў у маім жыцці было шмат — куды толькі ні ездзіла! І, дзякаваць Богу, заўсёды вярталася, бо чалавек я досыць рацыянальны, абачлівы, але ж... Мусіць, не без падстаў нашы продкі казалі, што і ў цесце можна палец вывіхнуць.

Паехала я ў Берлін, у камандзіроўку на чатыры дні, і, здаецца, першы раз у жыцці не купіла сабе зваротны білет. Падумала: а раптам усе неабходныя справы скончу раней? Цягнікоў жа адтуль багата, на нейкім прыеду, пабуду нялішні дзянёк з сыночкам, з мужам...

Ды не ўсё тое збываецца, на што чалавек спадзявацца: пражыла я ў Берліне (цудоўны, вядома ж, горад, але не Мінск) усе чатыры дні, здала ключы ад нумара ў гатэлі, за дзве гадзіны да адпраўлення экспрэса «Берлін — Варшава» прыехала на цэнтральны вакзал. Білеты на такія цягнікі ў аўтаматах не прадаюцца, прыйшлося адстаяць даўжэзную чаргу. А падышла яна, касірка па-нямецку, але ж вельмі па-нашаму кажа:

— На гэты цягнік месцаў няма.

У мяне і ногі падкасіліся: як гэта «няма»?! Мне трэба, прычым пазарэз, бо, паехаўшы на пазнейшым, я не паспею на працу. І чаму гэта няма? Павінны быць!

Спрабую яшчэ раз: займаю чаргу да іншай касы. Тут касірка трохі лагаднейшая, але кажа мне тое ж самае: месцаў няма. Хіба першым класам?

Не, гэта ўжо занадта, не з нашым шчасцем, як той казаў, бо падарожжа проста залатым атрымаецца! Спрабую паглядзець білеты на аўтобус, на самалёт, але і яны маёй праблемы не вырашаюць.

Значыць, трэба змірыцца, выйсця няма... Купляю квіток на пазнейшы цягнік і думаю, як патэлефанаваць свайму дырэктару, і чым патлумачыць (калі слухаць захоча), што ў пятніцу не з'яўлюся на працу? Думаю, куды падацца (ну не сядзець жа тут, на вакзале?) і дзе падзець свае рэчы...

З іх я і пачала. У Берліне цэнтральны чыгуначны вакзал — гэта горад у горадзе: пяць паверхаў, мноства скрыжаванняў, пуцей і перонаў, эскалатараў, крам і шапікаў, ліфтаў...

На адным з іх я вырашыла спусціцца ўніз, каб здаць свой багаж у камеру захоўвання. Ногі, што называецца, не нясуць, але ж заходжу ў кабіну, націскаю кнопку ніжняга паверха. Следам заходзіць яшчэ некалькі падарожнікаў. Ліфт кранаецца, але вязе чамусьці не ўніз, а ўгору. Такой бяды, думаю, часу навалам... Але тут яго шкляныя дзверы расчыняюцца і...

І перад вачыма ў мяне... мой перон, мой экспрэс Берлін — Варшава, ідзе пасадка і... ліфт ужо зачыняецца.

У апошняе імгненне, перад самым закрыццём дзвярэй, я паспяваю выскачыць, падбягаю да цягніка. Бачу правадніцу, якая спрабуе «ўтрамбаваць» у свой вагон ці не цэлую каманду маладых спартсменаў. У іх білеты, зразумела ж, ёсць, і правадніца проста ў стане стрэсу ад таго, што не паспее іх пасадзіць (да адпраўлення — дзве хвіліны). А тут яшчэ я... І таксама ў стрэсе — ад таго, што вось ён, мой шанц...

Амаль без надзеі на станоўчы адказ пытаю ў жанчыны, ці можна мне паехаць на гэтым цягніку, хоць у мяне білет на пазнейшы...

Кабета, зірнуўшы ў квіток, адказвае раптам (зноў жа на нямецкай мове, але зусім па-нашаму):

— Заходзьце, потым разбярэмся.

Вушам не веру, спрабую ўдакладніць, дапытацца «як гэта — потым разбярэмся?», але чую ў адказ тое ж самае: «Заходзьце, заходзьце хутчэй!».

Ай, думаю, была ні была: ныраю ў вагон — яшчэ раз, у апошнія секунды, перад самым адпраўленнем!

Ачомацца не магу аж да самай нямецка-польскай мяжы: я — еду, у Варшаве я паспяваю на цягнік да Мінска, мяне сустрэнуць... І ранкам я пайду на працу!

...Час ад часу памяць вяртае мяне ў той дзень, у Берлін, на вакзал. І тады я думаю, чаму з дзясяткаў ліфтаў мне трапіўся іменна той, які падымаўся да патрэбнага перона? Чаму ён паехаў угору, а не ўніз? Чаму не раней і не пазней, а за дзве хвіліны да адпраўлення цягніка? Чаму я адважылася загаварыць з той правадніцай?

Шмат пытанняў. А замест адказаў паступова прыходзіць і ахінае мяне такое важнае і такое каштоўнае для ўспрыняцца свету разуменне: калі нешта павінна быць, то знойдзецца сіла, якая накіруе ў патрэбны бок, якая падштурхне, а то і павядзе...

Праўда, для гэтага і самой трэба трохі пастарацца. Ну хаця б набыць білет... На пазнейшы цягнік.

А.Е.

г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

ВЕРШЫ З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

будуць гучаць у паэтычнай гасцёўні

XV Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі Маладзечна-2015

Кажуць, што паэты адчуваюць свет кончыкамі пальцаў — быццам навобмацак, мякка, але надзвычай дакладна. А яшчэ ёсць думка, што паэты — гэта прарокі свайго часу: у некалькіх словах, паэтычных радках яны могуць перадаць тое, на што хворы сённяшні свет або чым ён шчаслівы... Калі вы хочаце паслухаць сучасных паэтаў, то прыходзьце заўтра ў малую залу Палаца культуры Маладзечна ў 15 гадзін. Там, у межах аднаго з найбуйнейшых святаў — XV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі — пройдзе паэтычная гасцёўня пад назвай «Красуй, Беларусь».

Верагодна, гэта будзе адна з самых запамінальных падзей, бо разам збяруцца паэты маладыя і ўжо прызнаныя, тыя, каму ёсць што сказаць пра сённяшні дзень. **Паэтэса, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Таццяна СІВЕЦ,** якая будзе весці гасцёўню, адзначае:

— Нам часта даводзіцца чуць нараканні ў адрас арганізатараў: маўляў, паэтам адводзіцца мала месца на фестывалі песні і паэзіі. Таму гасцёўня — гэта адказ усім. Аўтары атрымаюць магчымасць пагутарыць з чытачамі, прадставіць сваю творчасць шырэй, чым гэта адбывалася звычайна. Яны падзеляцца тым, што іх хвалюе, раскажуць, што адбылося за мінулы год — якія кніжкі выпушчаны і якія вершы напісаны... Бо галоўная радасць для кожнага паэта — прачытаць свае вершы, пачуць рэакцыю калег і тых, хто цікавіцца літаратурай і, я ўпэўнена, прыйдзе ў паэтычную гасцёўню. Трапіўшы сюды, можна будзе ўбачыць своеасаблівы зрэз сучаснай беларускай літаратуры. Будуць прадстаўлены розныя ўзросты і пакаленні. Ад моладзі выступіць, напрыклад, Маргарыта Латышкевіч. Сярод добра вядомых чытачам аўтараў будуць Віктар Шніп, Алесь Бадак і іншыя. Выступяць як мясцовыя літаратары, так і сталічныя. Кожны творца атрымае магчымасць данесці да прысутных сваё пасланне.

Разам з Таццянай Сівец весці імпрэзу будзе паэт, дырэктар радыёстанцыі «Беларусь» Навум Гальпяровіч. Супрацоўнічаць ім даводзіцца не ўпершыню: летась гэты дуэт таксама вёў рэй у паэтычнай гасцёўні. Акрамя таго, яны ўжо 7 гадоў сумесна вядуць перадачу «Зямля, што нам дадзена лёсам» на Беларускім радыё. Таццяна Сівец адзначае, што ім камфортна працаваць разам, яны добра разумеюць адно аднаго і знаходзяць творчы баланс.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Не прапусціце!

ПЯЦЬ ВІДАЎ СПОРТУ ЗА ЧАТЫРЫ ДНІ...

UIPM MODERN PENTATHLON 2015 WORLD CUP FINAL MINSK, BELARUS

Беларуская сталіца рыхтуецца да правядзення фіналу Кубка свету-2015 па сучасным пяцібор'і. Турнір, у якім прымуць удзел 72 спартсмены (36 мужчын і 36 жанчын), адбудзецца з 11 па 14 чэрвеня на базе дзвюх пляцовак.

Спаборніцтвы па фехтаванні і плаванні прыме Беларускі ўніверсітэт фізічнай культуры. А наймацнейшых спартсменаў у верхавой яздзе, камбінаваным відзе (бег, стральба) і бонус-раўндзе па фехтаванні вызначаць у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі, што ў Ратамцы.

Між іншым, у фінале атлеты будуць змагацца за дзве ліцэнзіі (па адной у мужчын і жанчын) на Алімпіяду-2016. Да старту найбуйнейшага турніру года рыхтуюцца наймацнейшыя беларускія спартсмены — Павел Ціханаў, Раман Пінчук, Настасся Пракапенка і Ірына Прасянцова. Арганізатары спаборніцтваў абяцаюць цікавую спартыўна-забаўляльную праграму. У Ратамцы можна будзе пастраляць са спартыўных пісталетаў, паспрабаваць сябе ў фехтаванні і пакатацца на конях. Прыходзьце — не пашкадуеце!

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

«ЗОРКІ» СПОРТУ РАСКРЫВАЮЦЬ СВАЕ САКРЭТЫ

Як дэбютавала ў ролі вядучай Меліціна Станюта, дзе ў Мінску любіць гуляць Таццяна Троіна і якія перспектывы мае гольф у нашай краіне — пра гэта і не толькі аматары спорту змогуць даведацца, прачытаўшы майскі нумар часопіса «Наш спорт».

Таксама ў свежым нумары можна знайсці інтэрв'ю галоўнага трэнера беларускай жаночай зборнай па баскетболе Анатоля Буяльскага, які распавёў галоўнаму рэдактару часопіса Уладзіміру Здановічу пра падрыхтоўку каманды да чэмпіянату Еўропы.

Адзначым, што «Наш спорт» — адзін з нешматлікіх беларускіх глянцавых часопісаў, якія выходзяць у сегменце спартыўнай прэсы. Адметнай асаблівасцю гэтага штомесячнага выдання з'яўляецца багаты ілюстратыўны матэрыял, які дапаўняе актуальныя тэксты.

Настасся РУДКОЎСКАЯ

Навуку будуць папулярызаваць

Трохбаковае пагадненне аб стварэнні Міжнароднага даследчага цэнтра гісторыі навукі і тэхнікі падпісалі Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі, Інстытут гісторыі навукі і тэхнікі РАН і Інстытут гісторыі прыродазнаўства Кітайскай акадэміі навук.

Асноўнымі яго задачамі стануць рэалізацыя сумесных праектаў і праграм, каардынацыя даследаванняў у галіне гісторыі навукі і тэхнікі, якія праводзяцца ў Расіі, Кітаі і Беларусі, рэалізацыя сумесных праграм, прапаганда і папулярызацыя сусветнай гісторыі навукі і тэхнікі.

Стварэнне Міжнароднага даследчага цэнтра гісторыі навукі і тэхнікі на базе такіх вядучых сусветных навуковых цэнтраў, як Інстытут гісторыі прыродазнаўства і тэхнікі імя С.І. Вавілава Расійскай акадэміі навук і Інстытут гісторыі прыродазнаўства Кітайскай акадэміі навук, несумненна будзе спрыяць развіццю гэтай галіны навуковых даследаванняў у нашай краіне.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Извещение о проведении 17 июня 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)				
Наименование	**Инвентарный номер**	**Местонахождение**	**Начальная цена без НДС, бел. руб.**	**Размер задатка, бел. руб.**
Зубошлифовальный станок мод. AZA 1984 года выпуска	4251322	г. Минск, ул. Социалистическая, 2	203 116 000	20 000 000

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **17 июня 2015 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 05.06.2015 по 15.06.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»)
(017) 217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

29 июня 2015 г. проводит повторный открытый аукцион № 11-А-15 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 7 земельных участков для строительства объектов недвижимости в г. Минске:

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	ул. Кижеватова	500000000004005243	0,5687	комплекс сервисного обслуживания с благоустройством территории и сохранением водного объекта/земельный участок для размещения объектов иного назначения	810 654 010	120 000 000	19 678 295	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания ориентировочно до 660 кв.м, функциональное назначение объекта – комплекс сервисного обслуживания, состав объекта- кафе, магазин, миниавтосервис.
2	ул. Ромашкина (микрорайон Сокол)	500000000004005148	0,1000	кафе/земельный участок для размещения объектов общественного питания	131 891 320	20 000 000	19 901 293	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания ориентировочно 400 кв.м, состав объекта кафе.
3	В районе пересадочного узла «Восточный» – станция метро «Пролетарская»	500000000003004367	0,1028	временный объект торговли и общественного питания (срок эксплуатации не более 10 лет)/земельный участок для размещения объектов иного назначения	236 944 680	30 000 000	14 264 174	Проектирование объекта вести в границах предоставленного земельного участка, общая площадь здания (ориентировочно) не должна превышать 250 кв.м, состав объекта – объекты малого бизнеса: сопутствующей торговли и общественного питания.
4	В районе пересадочного узла «Восточный» – станция метро «Пролетарская»	500000000003004387	0,1800	временный объект торговли и общественного питания (срок эксплуатации не более 10 лет)/земельный участок для размещения объектов иного назначения	418 539 300	63 000 000	16 232 710	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания до 450 кв.м, для размещения объекта – объекты малого бизнеса: сопутствующей торговли и общественного питания
5	ул. Рафиева	500000000005006651	0,9300	зрелищно-познавательный объект/земельный участок для размещения объектов культурно-просветительного и зрелищного назначения	1 609 384 520	241 000 000	18 161 381	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания до 4200 кв.м, для размещения объекта – зрелищно-познавательный объект с кафе (развлекательный блок, кинозал, кафе). Возместить потери сельскохозяйственного производства в размере 68 449 165 руб. по состоянию на 25.10.2013 *.
6	ул. Селицкого	500000000002008390	1,6224	ресторанный комплекс с благоустройством территории и сохранением водного объекта/земельный участок для размещения объектов общественного питания	2 784 920 580	418 000 000	25 982 752	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания ориентировочно до 2500 кв.м, состав объекта – ресторан, кафе, бар, парковка.
7	ул. Космонавтов	500000000005006820	0,3600	кафе с развлекательным детским центром/земельный участок для размещения объектов иного назначения	718 483 080	108 000 000	25 502 253	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания ориентировочно 1000 кв.м, состав объекта – развлекательный детский центр, кафе на 50 посадочных мест (ориентировочно), открытые детские игровые площадки.

* Возмещение потерь сельскохозяйственного производства осуществляется в суммах, с учетом нормативов действующих на дату их **фактического возмещения**, **а также соответствующего уровня инфляции.**

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Условия, предусмотренные в решениях Мингорисполкома в отношении всех земельных участков:

проектирование вести в границах предоставленного земельного участка с учетом технических условий на инженерно-техническое обеспечение объекта и заключений согласующих организаций;

в месячный срок с даты государственной регистрации прав и ограничений (обременений) прав на представленный земельный участок приступить к разработке проектно-сметной документации;

не позднее 2 лет со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка для строительства объекта разработать и утвердить в установленном порядке проектную документацию на строительство объекта в полном объеме;

